БІБЛІЯТЭКА САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

БИБЛИОТЕКА СОЮЗА ПИСАТЕЛЕЙ БЕЛАРУСИ

Алесь МАРЦІНОВІЧ

# БЫЛОЕ, АЛЕ НЕ ДУМЫ

## СЁЕ-ТОЕ З ПРАЖЫТАГА І ПЕРАЖЫТАГА

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2016

УДК 821.161.1(476)-3
ББК 84(4Беи)6-44
М 29

**Марціновіч, А. А.**

М 29 Былое, але не думы : сёе-тое з пражытага і перажытага / Алесь Марціновіч. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2016. — 350 с. — (Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі).

ISBN 978-985-581-032-3.

Новая кніга лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь і шэрагу прэстыжных літаратурных прэмій Алеся Марціновіча — свайго роду споведзь пра час і пра сябе. Адметная яна тым, што згаданае ў ёй найчасцей падаецца з гумарам. Больш за тое, нярэдка прыводзяцца і такія сітуацыі з уласнага жыцця (дый з жыцця іншых пісьменнікаў), а таксама з журналісцкага і літаратурнага асяродку, пра якія, магчыма, можна было б і прамаўчаць. Кнігу «Былое, але не думы» нельга не прачытаць. Яе не адкладзеш убок нават тады, калі з аўтарам у нечым не пагаджаешся, бо ўсё, пра што расказвае ён, не пакідае абыякавым.

**УДК 821.161.1(476)-3**
**ББК 84(4Беи)6-44**

**ISBN 978-985-581-032-3**

© Марціновіч А. А., 2016
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва “Чатыры чвэрці”», 2016

# Адкуль ёсць пайшла гэтая кніга

Расійскі пісьменнік Юрый Бондараў вядомы, перш за ўсё, як раманіст. Аднак ён не цураўся і малых празаічных форм. Пра гэта сведчыць зборнік «Мгновения», што выйшаў у 1983 годзе ў маскоўскім выдавецтве «Молодая гвардия». У пачатку якога Бондараў прызнаецца: «…Всякая книга начинается гораздо раньше, чем написана первая строка. Много лет назад я задумал написать не повесть, не роман, не хронику, а книгу — мозаику человеческой жизни…»

Значна раней, чым быў напісаны першы радок, нарадзілася і гэтая кніга. Дарэчы, падштурхнуў мяне да напісання старэйшы сын Дзяніс. Перадгісторыя ж такая. Дзянісу, малодшаму Ягору дый жонцы я нярэдка расказваў цікавыя выпадкі з уласнага жыцця. Часам прыгадваў і тое, што адбывалася з маімі сябрамі ці з пісьменнікамі, якіх ведаў. Калі-нікалі з вуснаў іншых людзей чуў адметныя выпадкі з жыцця не толькі літаратараў. Найчасцей усё гэта — як са мною, так і з імі — адбывалася дзе-небудзь у застоллі, за сяброўскай чаркай, а то і ўвогуле ў неардынарных умовах.

Слухаў мой старэйшы сын гэтыя аповеды і аднойчы прапанаваў: «Чаму б табе, бацька, не напісаць кнігу пра ўсё гэта?». Аднак праходзіў год за годам, а я ўсё ніяк не мог наважыцца. Канешне, і іншых задум было шмат, і розных, не толькі літаратурных, клопатаў, але прычына марудлівасці хавалася ў іншым. Згадваючы тыя ці іншыя гісторыі, усё больш упэўніваўся, што тыя, хто мае да іх дачыненне, не заўсёды паўстаюць у выгадным святле. Зразумела, некаторыя прозвішчы можна не называць. Каму трэба, і так здагадаецца, пра каго ідзе гаворка.

Калі ж не здагадаецца, то такой бяды — галоўнае сутнасць.

А як быць самому? Хавацца за чужымі прозвішчамі не выпадае. Усё ж многае з таго, што не забылася, адбывалася менавіта са мной. Штосьці апусціць — таксама не выйсце, бо акурат гэтае «штосьці» — самае цікавае і адметнае. Апроч усяго, не давала спакою думка: ці не нашкоджу празмернай адкрытасцю самому сабе, ці не знойдуцца тыя, хто маю давяральна-шчырую споведзь выкарыстаюць супраць мяне? У нас жа апошнім часам столькі пісак у жанры ананімкі развялося. У «поце чала» стараюцца тыя, хто ў сваім воку і бервяна не бачыць, а ў чужым спакою не дае звычайная парушынка.

Чым больш праходзіла часу, тым часцей я пераконваўся, што кнігу «Былое, але не думы» трэба ўсё ж пісаць. Ёсць харошая прымаўка: ваўкоў баяцца — у лес не хадзіць. Той, у каго пастаянна жыве свярблівае жаданне каго-небудзь абліць памыямі, у любым выпадку знойдзе прычыну зрабіць гэта. Чалавек жа разумны ўсё ўспрыме спакойна. Дзе пасмяецца, у іншым выпадку, магчыма, і зарагоча. Часам задумаецца, а то і здзівіцца. А як жа інакш, калі ўсё гэта — се ля ві. Прыйшоўшы да такой, як мне здаецца, правільнай высновы, я ўжо не мог не ўзяцца за пяро.

Назву сваёй кнізе я даў па аналогіі з творам Аляксандра Герцэна невыпадкова. Ні ў якім разе не падумайце, што хачу заняць месца поруч з ім. У яго, як вядома, ёсць кніга «Былое і думы» — адна з лепшых у рускай мемуарнай літаратуры, у якой асабісты лёс пісьменніка ракрываецца ў шырокім гістарычным кантэксце. У мяне таксама былое, але гэта, канешне ж, не думы, а толькі пэўныя імгненні жыцця. Часцей нечаканыя, з гумарыстычнай падсветкай. Без прэтэнзіі на нейкі шырокі аналіз і ахоп падзей.

# Нажом... нямоглага

Адразу ўзнікла пытанне: «З чаго пачаць?» Запомнілася ж многае. Дый шмат што прэтэндуе на тое, каб пра яго расказаць у першую чаргу. Усё ніяк не мог вызначыцца наконт таго, якімі згадкамі адкрыць гэты свой аповед. Доўга думаў-разважаў, штосьці адпрэчваў, нешта канкрэтызаваў. Так працягвалася да таго моманту, пакуль у галаве маланкава ні прамільгнула думка: «А ці трэба Амерыку адкрываць?»

Пра што звычайна гавораць мужчыны, сабраўшыся за сталом? Канешне, шмат пра што. Але найперш, вядома, абавязкова згадваюць прыгожую палавіну чалавецтва. Хтосьці хваліцца сваімі амурнымі паходжаннямі. Нехта пагардліва крывіць вусны: маўляў, залівай, хвалько, ды меру знай. Знаходзіцца і той, хто, не звяртаючы ўвагі на гэта, чарговы раз рашуча напаўняе чаркі, даючы зразумець, што не дзеля гэтага сабраліся, каб траціць час на пустыя размовы. Трэба любіць, а не пра любоў гаварыць. Але і пасля перакуленых чарак гаворка працягваецца ў ранейшым рэчышчы. Вельмі ж казытлівая тэма. Дый усё тое, што тычыцца жанчын, на дзіва цікава.

То чаму б з разваг пра іх, прыгажунь, і не пачаць гаворку? «З дзяўчатак», як назваў жанчын гадоў трыццаць таму вядомы пісьменнік К., калі я завітаў да яго, каб запісаць інтэрв'ю для «Ліма». На розных пасадах давялося яму працаваць, а тады ўзначальваў адзін са сталічных літаратурных музеяў. Зразумела, на сваім месцы быў. Літаратуру любіў і ствараў, прапагандаваў нацыянальнае прыгожае пісьменства праз жыццё і дзейнасць аднаго з народных песняроў.

Адносіны з К., скажу шчыра, у мяне былі сяброўскія. Розніца ў гадах не перашкаджала зна-

ходзіць узаемапаразуменне. Безумоўна, на гэта паўплывала і тое, што на адзін з раманаў К. я напісаў рэцэнзію ў газету «Мінская праўда». Неаднойчы пад рубрыкай «Кнігі нашых землякоў» прадстаўляў чытачам тое, што з'яўлялася з-пад пяра ўраджэнцаў Міншчыны. К. таксама быў родам са сталічнага рэгіёна. Даводзілася мне сустракацца з К. і падчас яго працы ў апараце Саюза пісьменнікаў БССР.

Тым разам К. таксама сустрэў мяне прыязна. Ахвотна адказаў на пытанні, якія я яму задаваў, а паколькі дыктафонаў яшчэ не было, то гаворка зацягнулася. Прыйшоў час і крыху адпачыць. Не, К. не прапанаваў мне выпіць, хоць рэгулярна падчас абеду ў кафэ Дома літаратара абавязкова замаўляў для апетыту грамамаў 50 каньяку. Дый на такі пачастунак я і не разлічваў. Усё ж чалавек пры выкананні службовых абавязкаў. Увогуле, каб расслабіцца, дастаткова паразважаць пра жыццё. Тым больш К. самому хацелася, як кажуць, выйсці за межы інтэрв'ю без якой-небудзь «падрыхтоўкі».

Адкінуўшыся ў крэсле, сказаў:

— Ты ж, мабыць, ведаеш, Алеська, што я вельмі люблю дзяўчатак.

Падчас прызнання, што прагучала гэтак нечакана, на ягоным твары з'явілася ўсмешка, па якой можна было здагадацца, што акурат у гэты момант ён успомніў адну са сваіх дзяўчатак. А што дзяўчатак ён вельмі любіў, дый меў у іх немалы поспех, ні для кога ў пісьменніцкім, а таксама ў калялітаратурным асяродку сакрэтам не было.

— Узрост, праўда, ужо не той, — К., цяжка ўздыхнуўшы, даў зразумець, што гэта менавіта тое, што прыносіць яму праблемы, і дадаў: — Але ўсё адно люблю…

Нейкі час панавала цішыня. Мне чамусьці падумалася, што К. пазнаёміць мяне з цікавай гісторыяй, што адбылася некалі з ім на любоўным фронце. Такой гісторыяй, якая ніколі не забываецца, бо яе не-

магчыма забыць. Аднак К. не спяшаўся адкрываць мне штосьці інтымнае. Дый, я хутка зразумеў, што ён не ставіў перад сабой такой мэты. Яму проста хацелася выказацца, а пачаў з таго, што больш за ўсё «балела», бо калаўрот ягоных дзён няўхільна рабіў свае абароты, не прыбаўляючы ні здароўя, ні магчымасці любіць дзяўчатак так, як раней.

Маўчанне зацягнулася.

— Алеська, я неяк казаў Максіму, што пасля нашай смерці, калі хто і ўспомніць пра нас, дык толькі ты, — К. нечакана павёў гаворку ў іншым кірунку.

— Максіму Танку казалі? — я нічога не разумеў, пры чым тут Яўген Іванавіч — самы слынны беларускі паэт, чыё імя назаўжды прапісалася ў літаратуры. Пра яго пісалі і пісаць будуць заўсёды.

— Пра Танка знойдуцца ахвочыя пісаць, — К. быццам прачытаў мае думкі. — А вось пра мяне ды пра Максіма Лужаніна… — у ягоным позірку з'явілася столькі самотлівасці, што мне стала няёмка.

— Ды буду пісаць і пра вашу творчасць, і пра Лужаніна, — паспяшаўся запэўніць я.

— Пра гэта я Максіму і сказаў, — прадоўжыў К.

Крыху памаўчаўшы, ён зноў вярнуўся да таго, з чаго пачаў:

— Люблю, Алеська, дзяўчатак. Яшчэ як люблю! — на яго твары зноў з'явілася ўсмешка. Толькі не тая, як у пачатку гаворкі, а нейкая рамантычная, узнёслая. Нібыта ён нечакана скінуў са сваіх плячэй цяжар пражытых гадоў, зноў стаў маладым. — А колькі іх у мяне, прыгажунь, працуе?! — непрыкметна ён перайшоў на маналог. — На любую зірнеш — вачэй не адарваць. Кожная пекная. Так і хочацца абняць, пацалаваць. Эх, Алеська-Алеська, — уздыхнуў ён роспачна. — Іншым бы я не прызнаўся ў гэтым, а табе, як сябру…

Я застыў у прадчуванні чагосьці незвычайнага. «Ну і К., ну і зух!, — падумалася мне. — Ці не семдзесят ужо, а належыць да тых “коней”, якія бараз-

ну ніколі не псуюць. Няйначай, нешта такое расказа, што і маладзён пазайздросціць».

Аднак, уважлівей прыгледзеўшыся да К., зразумеў, што яго непакоіць штосьці іншае. Таму заставалася толькі слухаць, не перабіваючы, каб не знікла жаданне падзяліцца турботным, што не давала спакою.

— Ёсць у мяне адзін намеснік, — К. назваў яго прозвішча. — Ведаеш, да чаго дадумаўся? Пачаў, нягоднік, пісаць у ЦК, што я з гэтымі дзяўчаткамі… Сам разумееш…

Канешне, я разумеў, пра што пісаў у ЦК намеснік, таму і падзяляў абурэнне К. Аднак, прызнаюся шчыра, хоць гэта можа падацца дзіўным, за К. я ўсё ж радаваўся. Ёсць жа яшчэ порах у парахаўніцах. А што да ЦК, то там таксама людзі… Прабачце, мужчыны. То хіба ж мужчыны мужчыну не зразумеюць?

К. здагадаўся, пра што я падумаў.

— Эх, Алеська, — з ледзь прыкметнай крыўдай сказаў ён, ты нічога не разумееш, таму і ўсміхаешся… Я б яму дараваў гэтую пісаніну, але ж гэта…

— Што? — вырвалася ў мяне.

— Паклёп! — адказаў К. такім тонам, што я адразу зразумеў — ён не проста абураецца, яму балюча. Так балюча, што з цяжкасцю стрымлівае сябе, каб скупая мужчынская сляза не скацілася па шчацэ. — Быццам нажом ударыў, нягоднік! Пад самае сэрца! Ведаў, як гэта зрабіць. — К. яшчэ пільней паглядзеў на мяне, быццам разважаючы, адкрыць тайну ці ўсё ж лепш прамаўчаць. Але перамагло першае: — Ты, сябра, Алеська, таму табе і ўся праўда: узрост ужо не той! — прамовіў ён на адным дыханні.

К. замоўк. Пра што ён думаў, мне заставалася толькі здагадвацца. Магчыма, успомніў свае ваенныя гады, калі, кажуць, камандаваў штрафной ротай. Трапіўся б тады яму ў рукі гэты маралiст… Аднак, гэта толькі мае здагадкі.

Я таксама маўчаў, бо што ў такім разе скажаш? Чым суцешыш чалавека?

Разумеючы пікантнасць сітуацыі, К. хуценька прыўзняўся ў крэсле, працягнуў мне руку:

— Чакаю ў «ЛіМе» інтэрв'ю.

— Не сумнявайцеся, — запэўніў я і, зразумела, слова сваё стрымаў.

Калі на развітанне К. паціснуў мне руку, я на нейкае імгненне затрымаў яе ў сваёй. Гаспадар кабінета зразумеў гэта па-свойму.

— Можна было б і пагаварыць яшчэ, — быццам апраўдваючыся, сказаў ён, — але спраў стае.

Мне ж пасля яго шчырага прызнання захацелася расказаць адну гісторыю. Таксама пра дзяўчатак, але не зрабіў гэтага, каб не пакрыўдзіць К., бо гісторыя таксама неардынарная. Хоць іншага кшталту.

# Якія гулі? Я – не мужчына

Было гэта ў першыя пасляваенныя гады. Ведама, як тады жылося. І таго неставала, і гэтага. І не толькі прадуктаў. Не лепшае становішча было і з прамысловымі таварамі. А N. (назаву яго так, бо прозвішча не ведаю, пераказваю з чужых вуснаў) працаваў дырэктарам сталічнага ўнівермага. Таго самага ГУМа, які і сёння стаіць на ранейшым месцы.

Ва ўнівермагу ж, зразумела, было ўсё. Праўда, не на прылаўках. Дый не для ўсіх, а толькі для сваіх. Сваімі ж для N. з'яўляліся тыя, хто займаў пасады вышэйшыя, чым ягоная. Але хоць пасады ў іх і былі вышэйшыя, яны не мелі таго, што меў N. Таму, калі з'яўлялася неабходнасць набыць што-небудзь з таго, чаго на прылаўках днём з агнём не знойдзеш, адразу звярталіся да N. Ён стараўся нікому не адмаўляць. Асабліва тады, калі звярталіся работнікі ЦК. Яны, у сваю чаргу, ніколі N. у крыўду не давалі. Розныя спагнанні, вымовы яго заўсёды абыходзілі бокам. Нават у тых выпадках, калі іншыя за такую ж правіннасць маглі пазбавіцца пасады. Пад апекай ЦК ён адчуваў сябе, як у Бога за пазухай. Яму, па-сутнасці, было дазволена ўсё, а калі ўсё дазволена, то…

Што такое ўнівермаг? Калі коратка, то гэта — вялікі магазін з адпаведным штатам супрацоўніц. Так, дзяўчаткі, якіх гэтак любіў пісьменнік К. Любіў іх і дырэктар універмага. Дый як не любіць, калі ўсе ледзь не на падбор. А падборам, дарэчы, сам N. і займаўся. Прыйдзе каторая з заявай, каб уладкавацца на працу, дык яе адразу накіроўваюць у дырэктарскі кабінет. А там ужо N. і пачынае высвятляць, ці падыходзіць чарговая кандыдатура.



## МАРЦІНОВІЧ АЛЕСЬ (АЛЯКСАНДР АНДРЭЕВІЧ)

Нарадзіўся 18 жніўня 1946 года ў вёсцы Казловічы Слуцкага раёна. Скончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1968). Па размеркаванні працаваў у драгічынскай раённай газеце «Запаветы Леніна». У 1969–1971 гг. служыў камандзірам мотастралковага ўзвода ў Забайкальскай ваеннай акрузе. Пасля звальнення ў запас працаваў у Капылі і Слуцку. У 1972 годзе — у рэдакцыі штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва», якому аддаў 29 з паловай гадоў, з іх больш за два па сумяшчальніцтве. З лістапада 1999 года — у рэдакцыі часопіса Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Беларуская думка»: рэдактар аддзела літаратуры і мастацтва, намеснік галоўнага рэдактара, першы намеснік галоўнага рэдактара. Быў намеснікам галоўнага рэдактара часопісаў «Нёман»

і «Маладосць». Цяпер рэдактар аддзела навукі, крытыкі і літаратуразнаўства часопіса «Полымя».

Выступаць у друку пачаў школьнікам. Аўтар кніг, літаратурна-крытычных артыкулаў, нарысаў, эсэ «Мастацкі летапіс сучаснасці» (1983), «Далучанасць» (1990), «Пад небам вечнасці» (1990), «Дарога ў запаветнае» (1992), «Сувязь» (1994), «Шляхам праўды» (1994), «Дзе ж ты, храм праўды?» (1996), «Святло чароўнага ліхтарыка» (у дзвюх кнігах, 1997 і 1998), «Іван Чыгрынаў» (1999), «Бяссонне Млечнага Шляху» (2016), зборніка нарысаў пра ганаровых грамадзян горада Жлобіна «Жыццё прыгожае пражыць» (1992). Кніга пра маладую беларускую літаратуру «Сказаць сваё слова» ў 1989 годзе выйшла на англійскай, іспанскай, нямецкай і французскай мовах. Плённа працуе і ў галіне дзіцячай літаратуры: кнігі пра Еўфрасінню Полацкую, Кірылу Тураўскага, Сімяона Полацкага, Іосіфа Гурку, Максіма Багдановіча, Максіма Гарэцкага, а таксама кнігі казак.

Асаблівыя набыткі ў галіне мастацка-краязнаўчай літаратуры. Выдаў кнігі «Зерне да зерня» (1996), «Хто мы, адкуль мы...» (у дзвюх кнігах, 1996 і 1998), «У часе прасветленыя твары» (1999), «Элегіі забытых дарог» (2001), «Сполахі далёкіх зарніц» (2005), «Свечка на золкім ветры» (2006), «Птушкі з пакінутых гнёздаў» (2007), «Хто мы, адкуль мы...» (працяг дзвюх ранейшых пад такой жа назвай, 2007), «Маладзік над заснежаным шляхам» (2008), «Пяшчота апалага лісця», «Рагнеда і Рагнедзічы» (абедзьве 2010), «Успамін пра будучыню» (2012) і іншых. Усяго выдаў каля 70 кніг.

Алесь Марціновіч — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, літаратурных прэмій імя Максіма Багдановіча і імя Уладзіміра Калесніка, «Залаты Купідон» (двойчы), прэміі Беларускага Саюза журналістаў «Залатое пяро», двойчы заслужаны журналіст Саюза журналістаў. Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

# Змест

Адкуль ёсць пайшла гэтая кніга . . . . . . . . . . . . . . . . . 3
Нажом… нямоглага . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
Якія гулі? Я — не мужчына . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 10
Паэтэсы адметныя нагамі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 15
Маша, але не наша . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17
Кветкі для чужой кабеткі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 21
Месца «адсідкі» — камсамол . . . . . . . . . . . . . . . . . . 30
Сябра — даяр, я — трактарыст . . . . . . . . . . . . . . . . 33
Каньяк — і канцы ў ваду . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 36
Чаго не губляў, таго не знойдзеш . . . . . . . . . . . . . . 41
Мінулае не адпускае . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
Дзвесце грам — з кішэні . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 47
Тройня цялят і выраб № 1 у шуфлядзе . . . . . . . . . . . 51
Да свята — скібка з маслам . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53
Балансаванне на кладцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 56
Афрыканскі вопыт — няблага . . . . . . . . . . . . . . . . . 59
Дзе «гарпаліва», там і любові каліва . . . . . . . . . . . 62
Не надта фарсі, калі маеш джэрсі . . . . . . . . . . . . . . 64
Капялюш пракурора і паўголенькая прыгажунька . . 74
Сорак пяць — сама ягадкі збіраць . . . . . . . . . . . . . 78
Авантуры — не хаўтуры . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 84
Яма для пралетарыяту — ад пісьменнікаў . . . . . . . 88
Воўк, які «ставіў» пагранічныя слупы . . . . . . . . . . . 91
Хоць Ленін і «бядняк», але не бядак . . . . . . . . . . . . 96
Як я палюбіў Наталлю Белахвосцікаву . . . . . . . . . . . 99

Усе аднолькавыя? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 104
Каханне прыўкрасна ў трэцім класе . . . . . . . . . . . . . . . . 111
Падвяла Таццяна Бялова . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 115
Бочка з індыком у калодзежы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 119
Так і не стаў аўтарам «Камсы» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 123
На бэльцы — як на ложку . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 127
Матлос ніколі не памыляецца . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 132
Як Брэжнеў «лячыў» майго галоўнага рэдактара . . . 136
Ганарар, які «зняў» пенсію . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 144
Хочаш страляцца? Спярша пахмяліся . . . . . . . . . . . . . . 147
Стукнеш у сценку — знойдзеш бутэльку . . . . . . . . . . . . 149
Народны артыст Ц. і лёс майго пашпарта . . . . . . . . . . 155
Самагонка на кухні і партбілет у кішэні . . . . . . . . . . . 164
Ніягарскі вадаспад у рабочы час . . . . . . . . . . . . . . . . . 180
Ёлкі-палкі, няма выбівалкі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 183
Да Алы пайшлі — капітана знайшлі . . . . . . . . . . . . . . . 188
Ты адкуль, сабачка, адкажы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 193
Была магіла і няма . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 197
Вер не вер, ды гэта так . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 200
Каб жа толькі гэта . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 204
Не раскрывай раток на какорыцкай глыток . . . . . . . . 208
Таварыш генерал, ты мяне зваў? . . . . . . . . . . . . . . . . . 212
Калінінград — не для інтыму град . . . . . . . . . . . . . . . . 214
Канспект за гадзіну на цэлы сшытак . . . . . . . . . . . . . . 218
Пайсці да каханкі — застацца без пагонаў . . . . . . . . . 220
На закуску — кроў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 224
Герой за нас гарой . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 229
Быў гвалтаўнік і знік . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 232

Каб знаў, дык у рот не браў . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 241
Не столькі страшныя «прыкарытнікі», колькі… . . . . 243
Дай умовы — стану Талстым . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 251
Следства вядуць пакрыўджаныя . . . . . . . . . . . . . . . . . 258
Што са «здрадніка» возьмеш . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 261
Нечаканыя інтэрв'ю, або Як стаць пісьменнікам . . . 265
Трусы «металічныя» — праблемы не лірычныя . . . . 271
«Іронія лёсу»: беларускі варыянт . . . . . . . . . . . . . . . . 280
Жонка ўрач — з хворым сэрцам да каханкі не ідзі . . 287
Усё, што ні адбываецца, да лепшага . . . . . . . . . . . . . . 293
**Пра аўтара** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 302